**М. Лупсякоў “Мэры Кэт”. Заданні да ўрокаў.** ***Карта назіранняў (1 блок заданняў)***

| **Уменне знаходзіць інфармацыю** | **Уменне ацэньваць інфармацыю** | **Уменне выкарыстоўваць інфармацыю** |
|---|---|---|
| 1. З чаго пачалася ўся гісторыя?<br>2. Якія пісьменнікі, узгаданыя ў творы, працуюць у жанры дэтэктыву?<br>*(аналіз 1 часткі)* | 1.Ахарактарызуйце Эму Пшанічную.<br>2.Чаму галоўны герой у запісцы выкарыстаў мянушку Пантона-Мантона-Дэмантона?<br>3. Чаму Эма так хутка адказала на запіску Антона?<br>4.Чаму Эма з палёгкай уздыхнула, калі Антон Бубноў папрасіў у яе прабачэння? | 1. Любяць чытаць дэтэктывы – гэта развівае мысленне, хуткасць адказу, уменне думаць.<br>2. Веданне пісьменнікаў, якія працуюць у жанры дэтэктыву – жаданне пайсці ў бібліятэку. |
| 1. Зачытайце, чаму Антону было прыемна сядзець і адпачываць у хаце.<br>2. Зачытайце ўрывак, у якім М.Лупсякоў характарызуе Антона (с.148).<br>3. Якое параўнанне Эмы вызывае асаблівую варожасць у Антона?<br>*(аналіз 2 часткі)* | 1.Ахарактарызуйце Антона Бубнова.<br>2.Чаму думае пра Эму?<br>3.Чаму точыць сумленне, не дае спакойна сядзець?<br>4. Які ўрок атрымаў Антон пасля таго, як яго папрасілі выйсці з класа? | 1. Пасля выкананай работы прыемна сябе адчуваць. Спачатку зрабі – пасля адпачывай.<br>2. Ці сорамна ад таго, што папрасіў прабачэння?<br>3. Неспакойны душэўны стан, калі хтосьці цябе пакрыўдзіў. |

| | | |
|---|---|---|
| 1.Раскажыце пра ўзаемаадносіны паміж Эмай і Антонам.<br>*(аналіз 3 часткі)* | 1.Хто першы пайшоў на прымірэнне?<br>2.Чаму Антон упершыню пайшоў на танцы?<br>3.Чаму Эма Пшанічная пырснула ад смеху, калі ўбачыла Антона ў школе? | 1. Калі ўпершыню нешта робіш, адчуваеш сябе як не ў сваёй талерцы. |
| 1.Зачытайце апісанне кожнай пары года.<br>2.Знайдзіце апісанне Эмы, калі яна каталася на каньках?<br>*(аналіз 4 часткі)* | 1.Што можна сказаць пра Антона? Якія рысы характару пераважаюць?<br>2. Што адчуваў Антон, калі назіраў за Эмай?<br>3.Чаму Антону стала ясна, што ён дарэмна радаваўся сваёй перамозе над ёю? | 1. З якімі прафесіямі можа звязаць сваё жыццё Антон Бубноў? |
| 1.Што за вучаніца такая ў нас?<br>2. Якімі былі першыя ўрокі?<br>3. Зачытаць апісанне лёду.<br>*(аналіз 5 часткі)* | 1.Чаму зайздрасць не давала спакою?<br>2.Чаму вырашыў вучыцца катацца на каньках?Як аднёсся сам да гэтай думкі?<br>3.Чаму лёд спявае? | 1.Зайздрасць можа натхніць на добрыя ўчынкі.<br>2.Наперадзе ў мяне – здаровы, прыемны сон. |
| 1.Як даваліся ўрокі катання на каньках? (зачытаць)<br>*(аналіз 6 часткі)* | 1. Што трэба, каб навучыцца катацца на каньках?<br>2. Якія змены адбыліся з Антонам падчас трэніровак? | 1.Толькі папрацаваўшы, можна дасягнуць чагосьці.<br>2. Фізічныя нагрузкі, практыкаванні прыносяць |

| | | |
|---|---|---|
| | 3. Якое новае жаданне з’явілася ў Антона? | чалавеку змены ў лепшы бок. |
| 1.Колькі часу Антон вучыўся катацца на каньках?<br>2.Зачытайце дыялог паміж Эмай і Антонам.<br>3.Зачытайце апісанне душэўнага стану Антона пасля таго, як Эма прапанавала яму сябраваць.<br>*(аналіз 7 часткі)* | 1. Што важным аказалася для Антона, а што не важна?<br>2.Чаму Антон чуў, як гудзе лёд, а як аўтамашына гудзе – не чуў? | 1. Давай не будзем сварыцца, а будзем дружыць.<br>2.Мяне закружыла ў радаснай прыгажосці жыцця. |

***Карта назіранняў (2 блок заданняў)***

| **Уменне інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю** |
|---|
| 1. Складзіце план тэксту, падабраўшы да кожнай часткі загалоўкі. |
| 2. Перакажыце змест тэксту згодна складзенага плана. |
| 3. Апішыце сюжэт твора пры дапамозе малюнка (для тых, хто ўмее маляваць; хто не ўмее – славеснае маляванне) |
| 4. Перакажыце сцісла сюжэт твора, выступіўшы ад імя Эмы Пшанічнай. |
| 5. Перакажыце сцісла сюжэт твора, выступіўшы ад імя Антона Бубнова. |
| 6. Міні-сачыненне “Новае пачуццё” |

***Сінквейн (3 блок заданняў)***

| | |
|---|---|
| Эма Пшанічная.<br>Прыгожая, незвычайная, разумная. | Антон Бубноў.<br>Ціхі, спакойны, мэтанакіраваны. |

| | |
|---|---|
| Вучыцца, катаецца, усміхаецца.<br><br>Вось дык аграномава дачка!<br><br>Выдатніца. | Чытае, назірае, імкнецца.<br><br>Важна – што я навучыўся.<br><br>Сябар. |